ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
23
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 38 (1376)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

## ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

спартыўна-масавай работы супрацоўнікаў універсітэта за год. Камісія адзначыла шэраг недахопаў у арганізацыі спартыўнай работы і намеціла меры па іх ліквідацыі.

**І. ВАЛАСЕВІЧ.**

## ІНТЭРКЛУБ «ПАЛІТЫКУС»

правёў чарговае пасяджэнне. На ім абмяркоўваліся праблемы, звязаныя з агрэсіўнай палітыкай Ізраіля на Блізкім Усходзе, пытанні міралюбівай знешняй палітыкі СССР.

**А. АБДУЛЬМАДЖЫД,**
член інтэрпрэс-цэнтра.

## НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

маладых вучоных прайшла ва універсітэце. Тэма яе: «Сучасныя праблемы аховы, рацыянальнага выкарыстання і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў».

**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

## АГЛЯД-КОНКУРС

мастацкай самадзейнасці прайшоў на фізічным факультэце і прысвячаўся 60-годдзю ўтварэння СССР. Лаўрэатам агляду-конкурсу даецца права выступіць на універсітэцкім вечары савецкай песні.

**С. АЛЯКСАНДРАЎ,**
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

## БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

БДУ імя У. І. Леніна на чарговым пасяджэнні разгледзела стан унутрысаюзнай работы і меры па яе паляпшэнню ў камсамольскай арганізацыі геаграфічнага факультэта. Зацверджаны новы састаў штаба працоўных спраў БДУ і палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве паміж СБА факультэтаў у падрыхтоўчы перыяд.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СВЯТЫ

дзён незалежнасці адзначылі замежныя навучэнцы БДУ імя У. І. Леніна з Гвінеі, Танзаніі, Кеніі. Гэтым датам былі прысвечаны ўрачыстыя вечары, на якіх прысутнічалі прэзідэнты зямляцтваў, прадстаўнікі дэканатаў па рабоце з замежнымі навучэнцамі, а таксама замежныя навучэнцы ВНУ горада.

**С. СААД,**
член інтэрпрэс-цэнтра.



# АРЫЕНЦІРЫ ГРАМАДАЗНАЎЦАЎ

АДБЫЎСЯ СХОД партыйнага актыву універсітэта, які абмеркаваў работу кафедр грамадскіх навук па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС і пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў».

З дакладам выступіў прарэктар універсітэта **У. С. Багданаў.** У спрэчках выступілі дырэктар ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна **А. Д. Малочка,** загадчыца кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў **І. І. Жбанкова,** загадчык кафедры навуковага камунізму **П. П. Дронь,** дэкан гістарычнага факультэта **І. В. Царук,** сакратар камітэта камсамола **А. М. Рухля,** галоўны рэдактар выдавецтва **Н. Ф. Бязрукава,** дэкан біялагічнага факультэта **А. С. Шуканаў,** рэктар, акадэмік АН БССР **У. А. Белы.**

Сход партыйнага актыву БДУ імя У. І. Леніна падкрэсліў, што партыйныя арганізацыі, кафедры грамадскіх навук правялі вялікую работу па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук, удасканаленню працэсу фарміравання ў студэнцкай моладзі навуковага марксісцка-ленінскага светапогляду, актыўнай жыццёвай пазіцыі.

У адпаведнасці з рашэннямі XXVI з'езда КПСС прафесарска - выкладчыцкія калектывы кафедр грамадскіх навук актывізавалі метадычную, навукова-даследчую і прапагандысцкую работу. У 1981 годзе грамадазнаўцы універсітэта надрукавалі дзесяткі навуковых работ аб'ёмам больш чым 300 друкаваных аркушаў, з іх 18 манаграфій, 4 зборнікі навуковых артыкулаў. На кафедрах функцыяніруюць 43 навуковыя гурткі, у якіх займаецца звыш 750 студэнтаў. Значныя дасягненні грамадазнаўцаў універсітэта ў юбілейным 1982 годзе.

Шматгранная прапагандысцкая, грамадска-палітычная дзейнасць выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук. Толькі за апошнія тры гады імі прачытана каля 3 тысяч лекцый. Заслугоўвае адабрэння практыка калектыўных прапагандысцкіх выездаў кафедр для чытання лекцый, правядзенне навукова-тэарэтычных і практычных канферэнцый на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі.

Разам з тым сход партыйнага актыву адзначыў, што партыйным арганізацыям факультэтаў, партгрупам, прафесарска - выкладчыцкаму саставу кафедр грамадскіх навук, кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда партыі і ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў», неабходна і надалей павышаць навуковы і метадычны ўзровень выкладання грамадскіх дысцыплін, у поўным аб'ёме забяспечыць авалоданне студэнтамі марксісцка-ленінскім вучэннем, дабіваючыся цеснай сувязі яго з практыкай камуністычнага будаўніцтва.

Кафедрам грамадскіх навук патрэбна пастаянна ўдасканальваць формы і метады чытання лекцый, спецкурсаў, правядзення семінарскіх заняткаў, дабіваючыся глыбокага і асэнсаванага вывучэння студэнтамі першакрыніц, павышэння сацыяльнай актыўнасці студэнцкай моладзі.

Патрабуе паляпшэння падрыхтоўка спецыялістаў-грамадазнаўцаў вышэйшай кваліфікацыі, работа па абагульненню і распаўсюджанню лепшага вопыту выкладання, развіццю актыўных форм і метадаў навучання студэнцкай моладзі, удасканаленню вучэбна-выхаваўчай работы з замежнымі навучэнцамі.

У рабоце сходу партыйнага актыву прынялі ўдзел намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ **В. П. Кузьмянкоў,** інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ **Л. М. Давыдзенка,** намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў АК КПБ **С. Ф. Сіманькова,** загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Маскоўскага РК КПБ **В. М. Азараў,** намеснік начальніка ўпраўлення выкладання грамадскіх навук МінВНУ БССР **Л. Я. Землякоў.**

Сход партыйнага актыву прыняў адпаведную пастанову.

**У. БЯЛОЎ.**

## З НАШАЙ ПОШТЫ

# Студэнт і навука

У РАСТОВЕ-НА-ДОНЕ праходзіў Усесаюзны тур алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па спецыяльнасці педагогіка. У індывідуальным першынстве ўдзельнічала 65 чалавек (17 каманд). Каманда з Беларусі складалася з чатырох чалавек: трое студэнтаў з педінстытутаў, чацвёрты — Васіль Грычык, студэнт пятага курса біялагічнага факультэта нашага універсітэта. Ён стаў пераможцам рэспубліканскага тура, які праходзіў у мінулым годзе, а сёлета ўвайшоў у першую дзесятку на Усесаюзным туры, набраўшы найбольшую колькасць балаў у камандным першынстве. Беларуская каманда заняла на алімпіядзе 4-е месца.

Пераможцам уручаны грамата і бібліятэчка педагагічнай літаратуры.

**М. БЫЧКОВА,**
студэнтка біялагічнага факультэта, слухачка аддзялення журналістыкі ФГП.

# Сустрэчы вельмі рады

У ГОСЦІ да першакурснікаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта прыйшла старэйшая навуковая супрацоўніца літаратурнага музея Янкі Купалы Л. С. Давыдоўская, якая расказала пра жыццёвы і творчы шлях народнага песняра.

Слухалі Людмілу Сцяпанаўну, і ў памяці кожнага з нас зноў і зноў перагортваліся старонкі жыцця беларускага паэта, ажывалі славутыя вобразы Паўлінкі, гусляра, прыходзілі на думку любімыя купалаўскія вершы.

Многа новага, невядомага нам расказала Л. С. Давыдоўская. Не кожны з нас ведаў пра сустрэчу Янкі Купалы з латышскім пісьменнікам Янам Райнісам, якая адбылася ў 1926 годзе (пры вяртанні дамоў Райніс дамагаецца пастаноўкі на тэатральнай сцэне буржуазнай Латвіі купалаўскай «Паўлінкі»), ці пра тое, што вядомы верш Я. Купалы «Хлопчык і лётчык» быў любімым вершам першага касманаўта Юрыя Гагарына.

Л. С. Давыдоўская падрабязна расказала пра стварэнне і работу Літаратурнага музея народнага паэта ў Мінску, яго філіялаў у Вязынцы, Ляўках і ў Печышчах, што ў далёкай Татарыі, дзе жыў Купала ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Цікава было пачуць і пра новыя экспанаты, атрыманыя музеем да стагоддзя песняра. У прыватнасці пра ўспаміны Марыэты Шагінян аб сустрэчы з Янкам Купалам на І Усерасійскім з'ездзе пісьменнікаў.

Цікавая была размова. І звесткі, атрыманыя пры сустрэчы з Л. С. Давыдоўскай, безумоўна, спатрэбяцца будучым філолагам.

**С. ГАЛАУКО,**
студэнт філалагічнага факультэта, слухач аддзялення журналістыкі ФГП.

# Пачуццё локця

Ігар Ганчаронак, прастадушны Саша Галаваты і ўсмешлівы Іосіф Казімірчык, якога рабяты любоўна называюць Ёшкай. І ўсё ж яны разам, яны — калектыў.

Група ў яе цяперашнім саставе склалася на трэцім курсе. Праўда, шасцёра рабят вучыліся разам з першага. Яны і склалі касцяк. Навічкі, што прыйшлі на трэці курс, навічкамі адчувалі сябе нядоўга. Хутка звыкліся, зжыліся. Хто ведае, можа ім проста пашанцавала. Самі чацвёртакурснікі лічаць, што многім яны абавязаны свайму куратару Ігару Міхайлавічу Гулісу.

Як бы ні было, але нараджэнне групы адбылося. У ёй няма аднаго пастаяннага лідэра. Студэнты не адчуваюць патрэбы ў ім, таму што ўсе яны жывуць інтарэсамі калектыву, і кожны ведае, пра што думаюць яго таварышы. Рабяты не могуць прыпомніць ніводнага сур'ёзнага канфлікту.

**«Усе навукі можна падзяліць на дзве групы — фізіку і калекцыяніраванне марак».**
**(Э. Рэзерфорд).**

Зразумела, гэта толькі жарт вялікага вучонага. Але тым не менш будучыя фізікі з другой групы яго думку не падзяляюць. Кола іх інтарэсаў шырокае. Але фізіка застаецца фізікай, навукай, якой прысвечана ўсё жыццё. Галіна іх будучай спецыяльнасці — лазеры.

Расказваюць, што Рэзерфорд, падбіраючы чарговага супрацоўніка, адразу даваў яму заданне, і калі той пасля пытаўся, што рабіць далей, яго звальнялі, таму што заўсёды можна знайсці нешта нязробленае. І тым больш у вучобе. Праграма кафедры спектраскапіі і квантавай электронікі лічыцца адной з самых насычаных, але рабяты спраўляюцца. Мяркуйце самі: сярэдні бал групы ў летнюю сесію склаў 4,49. Вынікі гавораць самі за сябе.

Студэнты - чацвёртакурснікі — гэта ў зусім недалёкім будучым маладыя спецыялісты. І кожны з іх займаецца навуковай работай.

**«...Не те студенты, которые аудитории не покидают сто лет, а те, коворые прыгают в скорые и — привет!»**
**(З песні).**

Але студэнты - фізікі ўсё ж застаюцца студэнтамі. І таму яны ахвотна прыпамінаюць шматлікія сумесныя паходы і паездкі, вечары і сустрэчы, чым так багата студэнцкае жыццё. А ці можна ўявіць студэнта, які не быў у будатрадзе? Яны былі ўсе. У Хабараўску і Пскове, у Беларусі і Казахстане, у Карэліі. А потым усе разам адпачывалі.

Набліжаецца 60-годдзе з дня ўтварэння СССР. Да яго рабяты запланавалі паездку ў адзін з прыгажэйшых гарадоў краіны — Ленінград.

**«Традыцыйнае, стабільнае лідэрства».**
**(Іосіф Казімірчык, камсорг).**

Яшчэ на першым курсе група, у якой вучыліся шасцёра цяперашніх чацвёртакурснікаў, заняла першае месца ў аглядзе - конкурсе. У аглядзе - конкурсе гэтага года 2-я група IV курса прэтэндуе на самыя высокія месцы. Ды і не можа быць інакш. У групе шмат актывістаў: Саша Галаваты — старшыня прафбюро факультэта, Таццяна Ціхан — член камітэта камсамола, член бюро кафедры і студсавета, Ігар Ганчаронак і Сяргей Мураўёў уваходзяць у бюро кафедры.

Групу смела можна назваць і спартыўнай. Саша Манькоўскі — кандыдат у майстры па аўтаспорту. Паша Пракошын і Эмілія Перэс абараняюць гонар універсітэта па валейболу. А нарматывы ГПА здалі ўсе без выключэння. Так што, як бачыце, лідэрства стабільнае.

**«Нейтрон дае нам цудоўны прыклад сапраўды грамадскай з'явы. Яму падабаецца жыць у грамадстве, ён проста не можа без калектыву. Доказ: як толькі нейтрон пакідае атамную «толкучку», ён распадаецца».**
**(Зборнік «Физики шутят»).**

У чацвёртакурснікаў другой групы «нейтронны» характар. Мне нават цяжка ўявіць іх у адрыве адзін ад аднаго. Яны крочаць побач. І я ўпэўнена, што калі скончаць універсітэт, часта будуць побач. Таму што, акрамя ўсіх пачуццяў, характэрных для кожнага чалавека, ім уласціва яшчэ адно — пачуццё локця. Пачуццё, якое так патрэбна, якое не падвядзе. Не павінна падвесці.

**Ю. ГУРТОЎЦАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

Фота В. Шачака.









ЛІРЫЧНА-ІРАНІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ ГОРАЧА ВІНШУЕ СВАІХ СЯБРОЎ З НОВЫМ ГОДАМ!

# СЮРПРЫЗ

НА ГЭТЫ РАЗ я ўсё ж вырашыў згуляць у навагоднюю латарэю. Сплюнуў, як гэта належыць, тры разы праз левае плячо і купіў латарэйны білет з самым, на мой погляд, прывабным нумарам — 130013.

Розыгрыш у перадnавагодніх клопатах прайшоў непрыкметна. Я купіў табліцу і, з цяжкасцю стрымліваючы сябе, каб не зазірнуць, запячатаў яе ў канверт, каб зведаць сваё шчасце ў навагоднюю ноч.

Калі куранты і звон бакалаў абвясцілі свету аб наступленні Новага года, я выйшаў наперад, ва ўрачыстай абстаноўцы разрэзаў канверт, выцягнуў табліцу, дрыжачай рукой адшукаў нумар і... галава мая закружылася. Выйграў!

Я, як дзіця, скакаў вакол стала і ёлкі, уцякаў ад гасцей, якія наперабой гадалі, што я выйграў: машыну, халадзільнік, магнітафон... Нарэшце, мяне схапілі і прымусілі аб'явіць выйгрыш. Я адшукаў патрэбны радок і радасна прачытаў:

— З Новым годам!

**А. ВАЛОШЫН.**



— А можа лепш я раскажу вашу выдатную біяграфію!

# *Яшчэ раз пра Снягурачак*

ХОБІ Ў МЯНЕ ЁСЦЬ. У часопісах нават пішуць. Збіраю зімовыя ўзоры. Такая прыгажосць — вачэй не адвядзеш!

А нядаўна ўбачыў квадратныя сняжынкі цудоўнага ўзору. Ляжаць у дзяўчыны на футра і не знікаюць. Бліжэй падыходжу:

— Добры дзень!

— Добры...

— Здорава ў лесе.

— Так,—кажа,—прыгожа.

А на капялюшы такая сняжынка — дрыжыкі бяруць.

— Дзяўчына, не ведаю, як сказаць, але... давайце з вамі сустрэнемся. У кіно сходзім, піроженым паласуемся.

Гляджу, яна засаромелася, вачыма вялізнымі зірнула на мяне і гаворыць ціха-ціха:

— Давайце. Толькі ў кіно мне нельга. Лепш каля лесу.

А мне толькі гэта і трэба. Кіўнуў галавой і—дадому. Прыбег, схапіў мікраскоп, фотаапарат і зноў на ўзлесак. А дзяўчына ўжо чакае, і на футра новыя сняжынкі, яшчэ лепшыя.

— Вы мяне здымаць будзеце?—пытае.

— Так,—адказваю. А сам аб'ектыў на сняжынкі навёў і пстрык, пстрык!

— Вам мае сняжынкі падабаюцца?

— Яшчэ як!

— А я?..

— Шчыра кажучы, не паспеў разгледзець.

Тут яна бярэ якуюсьці сняжынку і мне ў рукі дае. Узяў я яе і — бацюхна!—сняжынка не растае. Пакуль я яе разглядаў, пакуль загортваў, гляджу, а дзяўчыны ўжо і след прастыў!

Сняжынка цяпер у мяне дома вісіць, за шклом. Усе прыходзяць, любуюцца. Здаецца, усё ў мяне добра, жыць бы ды жыць, толькі нешта ў грудзях пачало паколваць. Зрабілі мне рэнтгеназдымак, а там замест сэрца — сняжынка. З чаго б гэта?..

**А. ЮРОЎСКІ.**

# Малюнкі І. Арлова



— Дастаў ёлку, ды такую вялікую!..



Навагодні тэхагляд.

# *Фразы*

- Ядром каманды быў трэнер, а ў цэлым яна была моцным арэшкам.
- Далейшаму росту баскетбаліста перашкаджала ... столь.
- Футбольная каманда БМУ па-майстэрску рабіла «сцэнку».
- Спартсмен выкарыстаў усе спробы, але пагрэбаваў многімі магчымасцямі.
- Хочаце навучыцца пераадольваць перашкоды? Пабегайце па інстанцыях.
- Спыніся, імгненне! Цудоўней ты не станеш.
- З карысных парад: праглынуўшы крыўду, закусіце крыўдзіцелем.
- Калі і згубіць сваю годнасць, то з годнасцю.
- Аксіёмай прызнаваў толькі тую ісціну, якая ўзгоднена з начальствам.
- У яго быў свой погляд толькі на дэфіцытныя рэчы.

**Вымаўлялі А. БЕЛАВУС, В. НАЎЛЯНКІН.**

# РУЖОВЫ РАНАК

*Літаратурная старонка*

АЛА КАНАПЕЛЬКА

## ТАБЕ, ЗЯМЛЯ МАЯ, СУСВЕТ УДЗЯЧНЫ...

Мая зямля павенчана
ў Сусвеце
Світальным лёсам
белакорых дрэў.
Мо ў тых гаях сумеўся
вышні вецер
І пасвятлеў душой,
і падабрэў.

Мая зямля павенчана
ў Сусвеце
Блакітным кветам вечнае
вясны.
У край пралескавы
прыходзяць на дасвецці
Перад дарогай зорнаю сыны.

Мая зямля павенчана
ў Сусвеце
Вялікім полымем гарачае
зары.
Ніколі не саромецца
планеце
За вечныя агнёў тут алтары.

Мой край, твой лёс ніхто
не перайначыць,
Світальны лёс світальнае
зямлі.
Тваёй зары туману
не замгліць.
Табе, зямля мая, Сусвет
удзячны.

## ГЛЫБЕЛА НЕБА...

Глыбела неба, зоркі
халаднелі—
Ступіла восень зорнай
паласой.
Насілі пчолы мёд апошні
ў келлі
З лясных ружовых буйных
верасоў.

За жураўліным клінам
павуцінка
Плыла бяздумна з восеньскай
вярсты.
Яшчэ сінічкам весела
адцінькаць,
І лета бабіна, і жоўтыя
кусты.

А там дажджы рабінай
апякуцца,
І зашыпіць халодная раса.
Не мне, не мне красенцы
сёння ткуцца
Цягучай ніткай восені
ў пасаг.

І не мае то вусны загарчылі
Салодкім мёдам позніх
верасоў...
Ступіла восень зорнай
паласой.
І сняцца сны ўспамінамі
чужымі...

## «Вёсны» перадаюць эстафету «Вуснам»

АПОШНЯЯ ПА ЧАСЕ кніжка паэзіі, якую выдалі ўзлётаўцы, называлася «Вёсны». Але трэба сказаць, што яе «рабочая» назва, на самым пачатку прапанаваная, была двухчастковай, бо гучала так: «Вёсны і вусны». І толькі пры апошняй рэдакцыі кнігі ўзлётаўцы спыніліся на адным першым слове назвы, маючы на ўвазе, што другое слова можа таксама стаць назвай новай кнігі. І вось яно ўжо ёю становіцца. Новую кніжку вершаў рыхтуе наша аб'яднанне: «Вёсны» перадаюць эстафету «Вуснам».

Вершы, падрыхтаваныя ўжо для «Вуснаў», сёння вы можаце прачытаць. Асобна хочацца вылучыць з іх першапублікацыі нашых сённяшніх першакурснікаў: Іры Яцухна і Таццяны Алешка, якія радуюць свежасцю, шчырасцю, інтанацыяй голасу. Разам з тым просьба да ўсіх студэнтаў універсітэта, хто хацеў бы паспрабаваць свайго паэтычнага голасу ў «Вуснах»,—даслаць у рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт» свае новыя вершы.

**А. ЛОЙКА,**
**кіраўнік аб'яднання «Узлёт».**

СЯРГЕЙ УКРАІНКА

## НА КУПАЛЛЕ

Трымцеў гарачы небасхіл,
Рака палала.
Я ў бор ішоў, дзе дзівасіл
Шукаў Купала.

Спакой даносіў лёгкі пах
Ад кожнай краскі...
Я быў на ўлонях, на руках
Чароўнай казкі.
Пад спелы цокат салаўя,
У сэрцы бору
Хацеў, хацеў знасці і я
Той дзіва-корань.

Хадзіў, нібыта ўладар,
Уздоўж ускраін.
А бор... ён не адкрыў свой
скарб—
Не давярае...

***

П. В.

«Зірні—цалуюцца аблокі»,—
Шаптала ты, а я, дзівак,
Сядзеў і слухаў абы-як,
Не разумеючы намёку.

А потым крочыў
ледзь не ранкам
З да слёз абрыдлае гульні
І падаў моўчкі
на сяннік
Пад жаўрукову калыханку...

Бы недарэчную павіннасць
З табой я адбываў тады.
І вось пранесліся гады,
І я пракляў сваю
нявіннасць.

ІНА ЯЦУХНА

## ДАПІСАЦЬ БЫ...

Дапісаць бы «Палескую
хроніку».
Пра Апейку свайго
расказаць.
Гэта ты вінавата, Палессе,
Што я мару, як Мележ,
пісаць.

Гэта мова твая вінавата,
І зацятая скарга балот,
І старая бабуліна хата,
І наш сціплы і горды народ.

Мне ж у спадчыну продкі
пакінулі
Мову—ласку палескай
зямлі,
Задуменную родную песню
Долу скінулі з пер'ем буслы.

***

Першы студэнцкі касцёр —
З бульбай, са смажаным
салам,—
Над задрамаўшым сялом

Птушкаю песня ўзлятае.
Пяе касцёр і сябры
Пра дом родны, дружбу
і брацтва...
Гараць маладыя кастры,
Як ветразі юнацтва.

УЛАДЗІМІР СІЎЧЫКАЎ

## БАГАЧ

З дзівосаў, радасных адкрыццяў
Пабудаваны мой палац прынадны,
І я штодня па ім вандрую.
Прыадчыняю дзверы ў залы незнаёмых моў—
Іскрыстыя слупы святла ліюцца.
Па-новаму ўспрымаю ў іх трымценні
Сваіх уласных дыяментаў фарбы:
Зіхцяць-ільсняцца словы роднай мовы.

## ПІШУ З НАТУРЫ

Бухматая хмара зачапілася за мінуўшчыну—
Крыжы касцёла бернардзінак.
Здаецца, што паветра загусцела,
Што час не зможа рухацца наперад.
І толькі імпульсы «Ікарусаў»,
Што ляцяць над Нямігай, закутай у бетон,
Працінаюць пакой бурштынавага вечара.
Павольна адыходзіць траўня трэці дзень,
Дзень, у якім я быў шчаслівы.



Агні майго горада. Фотаэцюд В. Шачака.

АЛЯКСАНДР БЕЛЬСКІ

## СКІП'ЁЎСКІ ЛЕС

Стаяць задумліва бярозы,
Старыя сосны на гары.
Каля дарогі вербалозы
Саналіва шэпчуць на зары.
Расой абмыліся палеткі
Скіп'ёўскі лес вітае зноў.
На ўзлеску свежым ззяюць
кветкі
Паміж шырокіх мурагоў.
Загаманілі ціха хвоі,
Застукаў дзяцел на суку.
І працягнуў рабіне гордай
Дуб сваю моцную руку.
А ў мурашоў — кіпіць
работа,
Такая рупнасць і размах,
Што пазайздросціць
ім ахвота,
Бо поту знаюць яны смак.
Пачуўся гучны голас сойкі,
Дрозд засвісцеў, нібы
ў свісток.
Які чароўны ён і звонкі,
Радзімы Чорнага куток!
Запах чабор, і медуніца
Панесла свой гарачы пах.
І сэрца, быццам бы
крыніца,
Мацней забілася ў грудзях.
І як усё тут люба, міла,
Дзе нарадзіўся, вырас я.
Шумі ж прыветна, лес
Скіп'ёўскі,
Цвіці, як сад, зямля мая!

ТАЦЦЯНА АЛЕШКА

***

Я тебя теряю,
Ты меня теряешь,
Я с тобою рядом,
Ты не замечаешь.

Спутались дороги—
Росчерки крыла,
Осень-недотрога
Нам не помогла.

Я тянула руки,
Сыпались листы,—
Отпылал багрянец,
Спохватился ты.

## АИСТ

На дороге, крылья
Распластав нелепо,
Аист белоснежный,
Как частица неба,
Как осколок света
На бетоне сером...
Трасса скоростная,
Что же тут поделать?
Равнодушно мимо
Свист колес машинных,
Сколько он на свете
Прожил дней недлинных?..
Так вот начинаем—
Надо ль мелочиться?
Аист—символ счастья,
Да всего лишь птица!..

СЯРГЕЙ КАВАЛЁЎ

***

Ты танцуеш, я танцую,
Мы танцуем.
Не адчуеш, не адчую,
Не адчуем.

Ты з чужым і я з чужою.
Мы—чужыя.
Не з былым і не з былою.
Не былыя.

Не кахаеш, не кахаю.
Не кахаем.
Ты губляеш, я губляю.
Мы губляем.

Забываеш, забываю,
Забываем.
Адлятаеш, адлятаю.
Адлятаем...


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
23 снежня 1982 г.
Зак. 2940. АТ 21654.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ